**УДК 94(476)”15/17”161.3**

# ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА ШЛЯХТЫ ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА Ў КАНЦЫ XVI – ПАЧАТКУ XVII СТАГОДДЗЯ Ў СВЯТЛЕ СОЙМІКАВЫХ ІНСТРУКЦЫЙ

***канд. філас. навук, дац. І.А. БОРТНІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца асаблівасці функцыянавання палітычнай культуры шляхты Полацкага ваяводства ў канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя. У даследаванні дадзенага феномену на аснове соймікавых інструкцый вылучаны тры аспекты: адносіны шляхты да існуючай палітычнай сістэмы і яе важнейшых інстытутаў; сацыяльна-палітычныя каштоўнасці і нормы паводзін шляхты; рэакцыя шляхты на рашэнні інстытутаў палітычнай сістэмы, а таксама патрабаванні і пажаданні ў адрас апошніх. Устаноўлена, што шляхецкая культура Полаччыны характарызуецца высокай ступенню палітычнай актыўнасці. Шляхта добра разумела сутнасць палітычнай сістэмы і была ўпэўненая ў сваіх магчымасцях уплыву на палітычныя рашэнні. У яе палітычнай свядомасці замацаваліся такія каштоўнасці, як “вольнасць”, “роўнасць”, “братэрства”, “згода”, шанаванне традыцыі. Разам з тым у палітычнай культуры полацкай шляхты захоўваліся асобныя элементы рэгіянальнай свядомасці.*

**Уводзіны.** У канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя назіраецца працэс хуткай інтэграцыі Полацкага ваяводства ў сацыяльна-палітычную прастору Рэчы Паспалітай. Адным з важнейшых наступстваў дадзенага працэсу з’яўлялася завяршэнне фарміравання на Полаччыне станавай структуры грамадства. Мэта дадзенага даследавання – вызначыць асаблівасці функцыянавання палітычнай культуры шляхецкага стану ў рэгіянальных умовах Полацкага ваяводства ў пазначаны перыяд.

Галоўным паняццем, якое выкарыстоўваецца ў дадзенай рабоце, з’яўляецца “палітычная культура”. Яно было ўведзена ў навуковы зварот амерыканскім палітолагам Габрыэлем Алмондам у працы “The Civis Culture” ў 1956 годзе. Паводле яго, палітычная культура ўяўляе сабою сукупнасць падыходаў у адносінах да палітычнай сістэмы і яе асобных інстытутаў, а таксама ўяўленняў грамадства адносна сваёй палітычнай ролі ў дадзенай сістэме [Цыт. паводле: 1, s. 5]. Палітычная культура Рэчы Паспалітай на мяжы XVI – XVII стагоддзяў была грунтоўна даследавана ў працы польскага гісторыка Эдварда Апаліньскага “Kultura polityczna szlachty polskiej w latach 1587 – 1652” [1]. Ён зрабіў выснову аб тым, што дадзеная культура належыць да культуры ўдзелу, адметнымі рысамі якой выступаюць падтрымка грамадскасцю існуючай палітычнай сістэмы і разуменне яе сутнасці, палітычная актыўнасць, перакананасць ва ўласнай магчымасці ўплываць на палітычныя рашэнні, высокая ступень ведаў і кампетэнтнасці ў сферы палітыкі [1, s. 7, 294]. У беларускай гістарыяграфіі спроба комплекснага аналізу шляхты ВКЛ як сацыяльна-палітычнага феномену належыць П. Лойку [2].

Шляхецкая палітычная культура на Полаччыне не знайшла дастатковага асвятлення ў гістарыяграфіі. Выключэннем з’яўляецца артыкул В. Галубовіча, у якім даследуецца канфесійная праблематыка ў дзейнасці полацкіх соймікаў [10]. Сацыяльна-палітычныя інтэнцыі полацкай шляхты разглядаліся, як правіла, у кантэксце аналізу розных бакоў грамадскага жыцця Рэчы Паспалітай, найперш канфесійна-палітычнай барацьбы [11, с. 239 – 240, 546; 12, s. 170 – 173, 212 – 218; 13, s. 143, 223, 234, 239 – 240, 266; 14, s. 29; 15, s. 93 – 94; 16, s. 127 – 128, 143 – 144]. На інструкцыі полацкіх соймікаў спасылаюцца для ілюстрацыі асаблівасцяў палітычнай культуры ВКЛ і Рэчы Паспалітай Э. Апаліньскі і П. Лойка [1, s. 28, 35, 138, 170, 194; 2, с. 87]. Падрабязна даследаваны дакументы, выпрацаваныя полацкай шляхтай падчас рокашу 1606 – 1609 гадоў у працах Я. Мацішэўскага і Г. Віснэра [17, s. 157 – 159; 18, s. 207 – 208; 19, s. 294]. Пэўную ролю ў разуменні сутнасці палітычнай культуры рэгіёну маюць даследаванні В. Галубовіча, прысвечаныя канфесійным і этнічным асаблівасцям полацкай шляхты [20 – 22].

Крыніцамі дадзенага даследавання з’яўляюцца інструкцыі полацкіх соймікаў канца XVI – пачатку XVII стагоддзя. Сярод іх на наш час захаваліся наступныя:

фрагменты перадсоймавай інструкцыі сойміку, які адбыўся, відавочна, у канцы снежня 1596 – на пачатку студзеня 1597 года [3, s. 422]; перадсоймавая інструкцыя сойміку, які адбыўся, відавочна, у студзені 1598 года [апубл. у: 4, s. 237 – 243]; інструкцыя сойміку, які адбыўся 16 мая 1606 года, выдадзеная паслам на перадракашовы з’езд у Любліне [5]; інструкцыя сойміку, які адбыўся 18 сакавіка 1607 года, выдадзеная паслам на ракашовы з’езд у Енджэёве [6; 7, k. 188 – 189]; перадсоймавая інструкцыя сойміку, які адбыўся ў канцы сакавіка 1607 года [7, k. 190 – 191]; перадсоймавая інструкцыя сойміку, які адбыўся 4 снежня 1608 года [апубл. у: 8, с. 70 – 72]; перадсоймавая інструкцыя сойміку, які адбыўся ў жніўні 1611 года [9, k. 49 – 52].

У даследаванні палітычнай культуры полацкай шляхты на аснове соймікавых інструкцый намі вылучаны тры аспекты:

- адносіны шляхты да існуючай палітычнай сістэмы і яе важнейшых інстытутаў;

- сацыяльна-палітычныя каштоўнасці і нормы шляхты;
- рэакцыя шляхты на рашэнні інстытутаў палітычнай сістэмы, а таксама патрабаванні і пажаданні шляхты ў адносінах да палітычнай сістэмы.

**Адносіны шляхты да існуючай палітычнай сістэмы і яе важнейшых інстытутаў.** Пазначаны аспект уключае ў сябе характар разумення шляхтай асноўных паняццяў-сімвалаў, звязаных з існуючай палітычнай сістэмай, такіх як "Рэч Паспалітая", "Айчына", веданне шляхецкай супольнасцю сутнасці дзяржаўна-палітычнага ладу, а таксама стаўленне шляхты да асобных інстытутаў палітычнай сістэмы.

Паняцце "Рэч Паспалітая" было найбольш шырока распаўсюджаным сярод шляхты тэрмінам, які датычыў палітычнага ўладкавання дзяржавы. Паводле Э. Апаліньскага, Рэч Паспалітая ў свядомасці шляхты разглядалася як дзяржава, як сукупнасць соймавых станаў (кароль, сенат і пасольская ізба) і як супольнасць усёй шляхты [1, s. 27 – 30].

У соймікавых інструкцыях полацкай шляхты дамінавала разуменне Рэчы Паспалітай як дзяржавы. У шэрагу выпадкаў размова ішла пра агульную дзяржаву двух народаў без іх спецыяльнай артыкуляцыі: "(...) Pewni będąc cnoty y zyczliwosci Ich M ktorey w słuzbie Rzeczy Pospolitey od Ich M zawsze doznawalismy (...)"[1] [5, k. 3]; "Naprzod za obmyszliwanie JeKrM ktore o dobrym i pożytecznym Rptey czynic raczy pospołu z inszemi pany posły podziękowanie uczynic"[2] [8, c. 71].

У той жа час распаўсюджанай з'явай было акцэнтаванне ўвагі на дуалістычным характары Рэчы Паспалітай. І Э. Апаліньскі і П. Лойка ўказвалі на словы з інструкцыі полацкага сойміка паслам на Енджэеўскі з'езд у сакавіку 1607 года аб "Rzeczy Pospolitey naszey wspolney tak Koronney yako y Wielkiego Księstwa Litewskiego"[3] [1, s. 28; 2, c. 87; 6, k. 1]. У інструкцыі паслам на Люблінскі з'езд 1606 года таксама ў прэамбуле гаворка ідзе аб "wszytkiey Rzeczy Pospolitey tak Corony yako y Wielkiego Księstwa Litewskiego"[4] [5, k. 1]. Вельмі часта ў інструкцыях гаворыцца пра дзяржаву з дапамогай тэрміну "Карона і Вялікае Княства Літоўскае". Асабліва частым было ўжыванне дадзенага тэрміну ў інструкцыі 1606 года [4, s. 237; 5, k. 1,2; 6, k. 3]. Гэта ставіць пад сумненне, прынамсі адносна полацкай шляхты, тэзіс Э. Апаліньскага аб тым, што дадзены тэрмін меў маргінальнае значэнне [1, s. 28 – 29].

Разам з тым у інструкцыях полацкіх соймікаў знаходзіць адлюстраванне ўжыванне тэрміну "Рэч Паспалітая" ў значэнні супольнасці шляхты. У інструкцыі паслам на Люблінскі з'езд 1606 года гаворыцца пра тое, што шляхта з'язджалася на Стэнжыцкі з'езд для таго, каб паслухаць аб "направе" сваіх правоў і вольнасцяў і каб знесці "urazy Rzeczy Pospolitey"[5] [5, k. 2]. У дадзеным кантэксце пад "крыўдамі Рэчы Паспалітай" трэба разумець хутчэй не праблемы дзяржавы, а менавіта "крыўды", якія былі нанесены шляхецкаму стану палітыкай двара Жыгімонта Вазы, паколькі гаворка пра іх ідзе ў неадрыўнай сувязі з праблемай захавання правоў і вольнасцей шляхты. У такім жа сэнсе разумеецца Рэч Паспалітая і ў далейшым тэксце інструкцыі, дзе сцвярджаецца неабходнасць пакарання тых, хто імкнецца да абмежавання правоў і прывілеяў шляхты: "(…) tak jakoby y na potem żaden się nie ważył mimo prawa wolności около Rzeczy Pospolitey stanowic zawirać y praktykować (…)"[6] [5, k. 2].

Таксама ў інструкцыях полацкіх соймікаў шырока выкарыстоўвалася паняцце "Айчына". У інструкцыі паслам на Енджэеўскі з'езд 1607 года падкрэсліваецца "stała y nie odmienna chęc i miłośc swoie ku spolniey oyczyznie naszey"[7] [6, k. 2]. У апошніх радках інструкцыі 1608 года занатавана: "(...) wszytkie artykuły zgodą naszą spolnie namowione JchM. P. poslom podane y powierzone mają Jch M dobrze uważaiąc potrzeby y zdrowosc Oyczyzny z stany wszytkiemi tak na Ziezdzie wprzod słonimskim iako y na walnym seymie znayzac y concordowac co by z dobrym y pożytecznym nas wszytkich y Oyczyznie naszey bylo"[8] [8, c. 72]. У такім сэнсе паняцце Айчыны фактычна атаясамлівалася з паняццем Рэчы Паспалітай.

Аналіз сімвалічных паняццяў, звязаных з палітычнай сістэмай, мусіць быць дапоўнены даследаваннем разумення шляхтай сутнасці дзяржаўна-палітычнага ладу. Агульнапрынятым у сацыяльна-палітычнай думцы XVI – XVII стагоддзяў было разглядаць Рэч Паспалітую ў адпаведнасці з арыстоцелеўскай тэрміналогіяй як "змешаную манархію" ("monarchia mixta"). Гэта азначала тое, што ў аснове дзяржаўнага ладу

---

[1]"(…) Будучы ўпэўненыя ў цнотах і зычлівасці Іх Мосцяў, пра якія заўсёды мы бачылі ад Іх Мосцяў у службе Рэчы Паспалітай (…)" (Пер. аўт. ).

[2] "Наперад за абмеркаванне Яго Каралеўскай Мосцю, якое ён імкнецца рабіць супольна з іншымі панамі пасламі, аб дабры і карысці Рэчы Паспалітай, зрабіць падзяку" (Пер. аўт.).

[3]"Рэчы Паспалітай нашай агульнай, як кароннай, так і Вялікага Княства Літоўскага" (Пер. аўт.).

[4]"усёй Рэчы Паспалітай так Кароны як і Вялікага Княства Літоўскага" (Пер. аўт.).

[5]"крыўды Рэчы Паспалітай" (Пер. аўт.).

[6]"(…) так, каб і ў далейшым ніхто не адважваўся па-за правам вольнасці ў дачыненні Рэчы Паспалітай устанаўліваць, заключаць і практыкаваць (…)" (Пер. аўт.).

[7]"пастаянная і непахісная наша прыхільнасць і любоў да агульнай нашай айчыны" (Пер. аўт.).

[8]"(…) усе артыкулы нашай згодай супольна наказаныя Іх Мосцям панам паслам, дадзеныя і даручаныя ім, маюць Іх Мосці, добра памятаючы пра патрэбы і здароўе Айчыны, з усімі станамі як на бягучым Слонімскім з'ездзе, так і на вальным сойме абмяркоўваць і вырашаць, каб добра і карысна нам усім у Айчыне нашай было" (Пер. аўт.).

знаходзілася гарманічнае ўзаемадзеянне трох соймавых станаў – караля, сенату і шляхты, якія адлюстроўвалі тры элементы палітычнай сістэмы – адпаведна манархічны, арыстакратычны і дэмакратычны.

У інструкцыях полацкіх соймікаў няма глыбокіх тэарэтычных рэфлексій над сутнасцю дзяржаўна-палітычнага ладу. Аднак некаторыя важныя з пункту гледжання шляхты ўяўленні ў іх змешчаны. У якасці гаранту стабільнасці палітычнай сістэмы разглядалася права. У інструкцыі на Люблінскі з'езд 1606 года выказваецца абурэнне з нагоды неправавога завяршэння сойму 1606 года: " (…) zniewaženie praw y wolnosci naszych przysięga K J M potwierdzonych y opresją głosow wolnych panow posłow woiwodztw y powitow na seym posłanych zniesieniem praw starych takim niesłychanym zawiraniem seymow w tumulciech (…)"[9] [5, k. 2]. Легітымнасць шляхецкага з'езду абгрунтоўваецца тым, што ён закліканы вярнуць раней зацверджаныя парушаныя правы [5, k. 2 – 3]. Такімі ж самымі выразамі абгрунтоўваецца законнасць рокашу ў інструкцыі 1607 года на Енджэеўскі з'езд: "(…) prawa, wolności y obowiązki iako dawne, tak i teraznieysze nie odstepuiąc ich ni w czem, przy nich się opowiadamy y statecznie trwać chcemy (...)"[10] [6, k. 1].

Больш цікава разгледзець, якім чынам полацкая шляхта бачыла месца і ролю ў палітычнай сістэме асобных інстытутаў, такіх як кароль, сенат, сойм, а таксама шляхецкі рокаш.

Кароль як адзін з соймавых станаў лічыўся часткай Рэчы Паспалітай і адначасова яе кіраўніком. Стаўленне да каралеўскай асобы адзначалася асаблівай павагай і пашанай. Нават у інструкцыі паслам на Люблінскі з'езд 1606 года з выразна апазіцыйным зместам кіраўнік дзяржавы называецца "Каралеўскай Яго Мосцю, панам нашым міласцівым" [5, k. 1]. Нават калі палітыка караля выклікала незадаволенасць, шляхта імкнулася ўстрымліваецца ад яго непасрэднай асабістай крытыкі. У гэтай сувязі яскравай з'яўляецца прамова трайдэнскага кашталяна, прадстаўніка полацкай шляхты Пятра Стаброўскага на Сандамірскім ракашовым з'ездзе ў жніўні 1606 года, у якой віна за пралікі ў каралеўскай палітыцы ўскладалася на сенатараў [17, s. 284; 24, s. 50 – 51]. У інструкцыі 1611 года полацкая шляхта, выступаючы супраць вайны з Маскоўскай дзяржавай, не абвінавачвала непасрэдна ў яе развязванні караля, а патрабавала ад яго знайсці і пакараць падбухторшчыкаў да вайны [1, s. 138; 9, k. 49].

Разам з тым для шляхты Рэчы Паспалітай, як гэта абгрунтаваў Э. Апаліньскі, быў характэрны моцны недавер да караля, паколькі лічылася, што манархам па сутнасці сваёй уласцівае імкненне да абсалютнай улады [1, s. 56 – 57]. Таму шляхта заўсёды вельмі клапацілася пра захаванне каралём абавязацельстваў аб абмежаванні сваіх паўнамоцтваў. Ужо ў 1590-я гады распаўсюдзіліся чуткі аб імкненні Жыгімонта Вазы да абсалютнага кіравання. Гэта знайшло свой выраз у інструкцыях полацкіх соймікаў 1597, 1598 і 1608 гадоў, у якіх ад караля патрабавалася прытрымлівацца пунктаў пакта канвента [3, s. 422; 4, k. 237; 8, c. 71]. Пра захаванне каралём гарантаваных ім правоў і свабод шмат гаварылася ў інструкцыі на Люблінскі з'езд 1606 года. У прыватнасці там падкрэслівалася права вольнай элекцыі [5, k. 1 – 3].

Наступным "соймавым станам" з'яўляўся сенат. Найбольш выразна разуменне полацкай шляхтай прызначэння і ролі сенату адлюстравана ў інструкцыі паслам на Люблінскі з'езд 1606 года: "(…) Ich MM pp. Senatorow, iako strożow praw wolności naszych, aby się w to włożyli y tak do tego JKM wiedli, jakoby te wszytkie urazy Rzeczy Popolitey zniesione byli, y Artykułom ktorym ieszcze dotąd do KJM poprzysiężonym dosić się nie stało, aby się we wszytkim dosic się stało, autoritate sua senatoria w to się wdali (…)"[11] [5, k. 1]. Такім чынам, у свядомасці полацкай шляхты дамінавала ўсеагульнае ў Рэчы Паспалітай уяўленне, што сенат павінен выконваць кантралюючую, дарадчую (у адносінах да караля) і медыятыўную (у выпадку канфлікту паміж каралём і "абывацелямі") функцыі [1, s. 60].

Надзвычай важная роля ў свядомасці шляхты належала сойму як інстытуту, які з'яўляўся галоўным увасабленнем шляхецкай дзяржавы. Менавіта з соймам "абывацелі" ў першую чаргу звязвалі надзеі на рэалізацыю сваіх патрабаванняў і пажаданняў. Аб гэтым сведчылі ўжо самі факты ўдзелу шляхты ў перадсоймавых сойміках, складанне інструкцый паслам. Інструкцыя на Люблінскі з'езд ілюструе вострую незадаволенасць полацкай шляхты з нагоды завяршэння сойму без прыняцця да ўвагі каралём і значнай часткі сенату патрабаванняў большай часткі шляхецкіх паслоў [5, k. 1 – 3].

У гэтай сувязі паўстае пытанне пра змены ў разуменні ролі сойму ў свядомасці шляхты пад уплывам палітычных канфліктаў, а таксама пытанне пра яе ўяўленне аб нефармальных шляхецкіх з'ездах і рокашы. У інструкцыі на Люблінскі з'езд 1606 года пасля выказвання абурэння з нагоды парушэння правоў шляхты пры завяршэнні сойму сцвярджалася: "Gdyż na seymiech przez pany posły swe otrzymac nic nie

[9]"(…) знявага правоў і вольнасцяў нашых, пацверджаных прысягай Каралеўскай Яго Мосці, і няўвага да галасоў вольных паноў паслоў з ваяводстваў і паветаў на сойм пасланых парушэннем старых правоў такім нечуваным завяршэннем соймаў у тумультах (…)" (Пер. аўт.).

[10]"(…) правоў, вольнасцяў і абавязкаў як даўнейшых, так і цяперашніх, ні ў чым не адыходзячы, прытрымліваемся і жадаем пры іх цвёрда стаяць (…) (Пер. аўт.).

[11]"(…) Іх Мосцяў паноў сенатараў як гарантаў правоў і вольнасцяў нашых, каб яны раілі і настойвалі перад Яго Каралеўскай Мосцю на тым, каб усе крыўды Рэчы Паспалітай былі скасаваны, а артыкулы, дадзеныя раней Каралеўскай Яго Мосцю пад прысягай, якія дагэтуль не выкананы, каб былі выкананы, выкарыстоўваючы свой сенатарскі аўтарытэт (…)" (Пер. аўт.).

mogą, insze sprawy potrzeby jako wszytka Rzeczy Pospolitej tak osobliwie woiwodztwa naszego zachodzące fidei forum poruczamy, będąc pewni że wszem ostrzegą prawy wolności naszych (…)”[12] [5, k. 3 – 4]. Падобныя дэкларацыі ў той час былі характэрныя і для многіх іншых павятовых соймікаў. Гэта сведчыла пра тое, што расчараванне шляхты ў магчымасцях рэалізаваць свае патрабаванні з дапамогай сойму актуалізавала ідэю непасрэднай шляхецкай дэмакратыі ў форме рокашу.

Пётр Стаброўскі ў сваёй прамове на Люблінскім з'ездзе ў чэрвені 1606 года даводзіў, што паколькі сенат не знаходзіцца ў адзінстве з шляхецкім станам, таму з дапамогай сойму марна спадзявацца на рэалізацыю патрабаванняў “абывацеляў”. Адзінае выйсце, на яго думку, – гэта рокаш, які разумеўся як з'езд усёй шляхты Рэчы Паспалітай, на якім павінны адбыцца абмеркаванне найважнейшых дзяржаўна-палітычных пытанняў, а таксама суд над парушальнікамі шляхецкіх правоў і вольнасцей [17, s. 186 – 187; 23, s. 22 – 23]. З прамовы зразумела, што на такім сходзе вярхоўным носьбітам улады выступае ўся супольнасць шляхты, а кароль і сенатары павінны з'яўляцца на яго для таго, каб апраўдвацца перад шляхецкімі прэтэнзіямі: “Do rokoszu należy osoba królewska, tak mi sie zda, aby deputaci z województw referowali urazy prywatne i publiczne, gdyż ex privatis personis res constat, i posłać wszystkie do króla i wokować go w pośrodek nas, aby sie nam z tego wszytkiego justifikował, a tych którzy mu tej rady dodawali, nam tu wydał. Nadto zabieżec temu, iż Rzeczplita daje królom skrypta do panowania, w mocy je też ma, in tali praesertim casu zatrzymać i odchylić trochę (...) Także i ze strony pp. Senatorów, jeśli ta perturbacyja za ich niedbalstwem, czy za radą i pomocą stała się, aby stanęli i nam się justifikowali (…)”[13] [23, s. 23]. Як папярэджанне каралю гучаў іншы магчымы варыянт дзеянняў шляхты: “(...) swiadczą annales, ze wiele panów degradowano, gdy prawa nie trzymali”[14] [23, s. 22]. У дадзенай прамове можна заўважыць праяву ўзнікшай у еўрапейскай думцы ранняга Новага часу тэорыі народнага суверэнітэту і звязанага з ім права на супраціўленне тыраніі[15]. Супольнасць шляхты выразна атаясамліваецца з дзяржавай, а кароль і сенатары разглядаюцца як слугі Рэчы Паспалітай, якія могуць быць адхілены ў выпадку парушэння права або дрэннага выканання сваіх абавязкаў.

Улічваючы прыхільны рокашу тон інструкцыі на Люблінскі з'езд, наўрад ці можна сумнявацца, што падобныя ідэі мелі шырокую папулярнасць сярод полацкай шляхты. 2 лютага 1607 года полацкая шляхта накіравала ліст да Януша Радзівіла, у якім выказала яму падзяку за актыўную дзейнасць у справе рокашу. Дадзены ліст падпісалі каля 40 асоб [13, s. 239 – 240; 24]. У інструкцыі паслам на Енджэеўскі з'езд у сакавіку 1607 года пазітыўна ацэньваецца досвед Люблінскага і Сандамірскага з'ездаў, адзначаецца невыкананне каралём патрабаванняў ракашовай шляхты і рашучае жаданне працягу рокашу. Характэрна, што адным з трох паслоў на з'езд быў абраны Пётр Стаброўскі. У той жа час шляхта выказала недавер сойму, адмовіўшыся высылаць на яго паслоў [6, k. 1 – 3]. Праўда, дадзеная інструкцыя не адлюстроўвала ўсеагульнага настрою шляхты. Напярэдадні сойму 1607 года сярод яе адбыўся раскол. Частка шляхты арганізавала новы соймік і накіравала паслоў на сойм. Але нават інструкцыя гэтага сойміка патрабавала ўлічыць пажаданні ракашовай шляхты, выказаныя ў “Сандамірскіх артыкулах” [7, k. 190 – 191].

Шырокая падтрымка рокашу на Полаччыне выступае даволі характэрнай з'явай. Гэта можна ў пэўнай ступені патлумачыць тым, што полацкая шляхта была пераважна незаможнай і ў рокашы магла бачыць спробу суперніцтва з магнатэрыяй.

**Сацыяльна-палітычныя каштоўнасці і нормы паводзін шляхты.** Пазначаны аспект уключае ў сябе такія сацыяльна-палітычныя каштоўнасці шляхты, як “вольнасць”, “роўнасць”, “братэрства”, “згода”, шанаванне традыцыі, а таксама нормы палітычных паводзін шляхты, што прадугледжваюць разуменне ўласнай ролі і месца ў палітычнай сістэме, спосабаў рэалізацыі правоў і абавязкаў.

Паняцце вольнасці вельмі часта выступае ў інструкцыях полацкіх соймікаў, што ў цэлым было характэрнай з'явай для палітычнага мыслення шляхты Рэчы Паспалітай. Як правіла, яно выступае ў выглядзе формулы “правы і вольнасці” або “правы, свабоды і вольнасці”. Такім чынам, вольнасць атаясамлівалася са станавымі правамі і прывілеямі шляхты. Э. Апаліньскі вылучае тры асноўныя віды шляхецкіх вольнасцяў: свабода слова, веравызнання і выплаты падаткаў [1, s. 80].

Свабода слова азначала права шляхціца да свабоднага выказвання сваіх думак і меркаванняў. Палітычнай маніфестацыяй гэтага права было змяшчэнне скаргаў і патрабаванняў у соймікавых інструкцыях і агучванне іх пасламі на соймах. Характэрна, што падчас рокашу яго ідэолагі разглядалі сойм у

[12]“Паколькі на соймах з дапамогай нашых паноў паслоў нічога атрымаць не можам, справы, патрэбныя як усей Рэчы Паспалітай, так і асабліва нашаму ваяводству, даручаем бягучаму з'езду, будучы ўпэўненыя, што ён стане ва ўсім апірышчам нашых правоў і вольнасцяў” (Пер. аўт.).

[13]“На рокашу павінна быць каралеўская асоба, як мне падаецца, каб дэпутаты з ваяводстваў агалошвалі свае прыватныя і супольныя крыўды. Трэба запрасіць да нас караля, каб ён нам усё гэта патлумачыў, а тых, хто даваў яму парады, нам выдаў. Трэба разумець, што калі Рэч Паспалітая дае каралям права да кіравання, то ў яе моцы таксама некаторым спосабам яго трохі абмежаваць і затрымаць (…) Таксама калі якая-небудзь пертурбацыя адбылася з-за нядбальства або парад і дзеянняў паноў сенатараў, каб яны перад намі сталі і растлумачылі (…) (Пер. аўт.).

[14]“(…) аналы сведчаць, што шмат уладароў дэтранізавана, калі яны не прытрымліваліся права” (Пер. аўт.).

[15]Пра сувязь ракашовай думкі ў Рэчы Паспалітай з дадзенымі канцэпцыямі гл. [1, s. 66 – 67].

першую чаргу як пляцоўку для актуалізацыі, абмеркавання і ўвядзення ў жыццё шляхецкіх патрабаванняў. Усведамленне каштоўнасці свабоды слова можна назіраць у полацкай інструкцыі на Люблінскі з'езд 1606 года. Крытыкуючы неправавое ўхваленне падаткаў на сойме, полацкая шляхта ўказвае: "A iż conclusia tych podatkow niezgodna y z wielu woiewodztw i powiatów przeciw temu się protestowali, których głosy wolne zagłuszane byli"[16] [5, k. 1]. Як відаць, пратэст быў абумоўлены ў значнай ступені тым, што на сойме не былі выслуханы і ўлічаны меркаванні прадстаўнікоў шляхецкага стану.

Свабода веравызнання азначала роўнасць правоў шляхты незалежна ад іх веравызнання ў межах хрысціянства, а таксама права да змены веравызнання без якіх-небудзь праваых наступстваў. Дадзенае права было абаронена актам Варшаўскай канфедэрацыі 1573 года, які быў уключаны ў Статут 1588 года. Патрабаванні захавання рэлігійнага міру і дапаўнення акту Варшаўскай канфедэрацыі канкрэтнымі прававымі гарантыямі гучаць ва ўсіх вядомых полацкіх інструкцыях разглядаемага часу [3, s. 422; 4, k. 237 –238; 7, k. 191; 8, c. 71; 9, k. 51 – 52]. У інструкцыі 1611 года шляхта патрабавала забяспечыць свабоду праваслаўнага культу згодна з соймавай канстытуцыяй 1609 года. Нагодай для гэтага стаў гучны канфлікт уніяцкага мітрапаліта Іпація Пацея з Віленскім праваслаўным брацтвам. У прыватнасці, у інструкцыі змяшчалася патрабаванне вызвалення арыштаванага брацкага пісара Лявонція Карповіча. Характэрнай выступае пры гэтым аргументацыя: "A yz pisarz ych bracki szlachcic uczciwy, iako go mianują prawem nie przekonany iest wprzód przez prywatną ludzie do wiezienia wzięty. A potem przez rożne wiezienie y dotąd iest utrapiony snać w czym prawo nasze pospolitą wolności szlacheckiey są naruszoną (...)"[17] [9, s. 51]. Такім чынам, свабода веравызнання разумелася перадусім як спецыфічны шляхецкі прывілей.

Падатковая свабода азначала вызваленне шляхты ад выплаты абавязковых падаткаў. Пытанне аб дазволе на "пабор" было, як правіла, адным з цэнтральных на сойміках. Часта такі дазвол звязваўся з задавальненнем на сойме шляхецкіх патрабаванняў. Так, полацкі соймік 1606 года перад адпраўленнем паслоў на Люблінскі з'езд адмовіўся выплочваць "пабор" з прычыны нежадання караля і сената задаволіць на сойме патрабаванні шляхецкага стану [5, k. 1 – 2]. Інструкцыя 1598 года адмаўляла ў выплаце "пабору" (між іншым тое ж самае сцвярджалася ў іншых інструкцыях з ВКЛ) з прычыны голаду ў Вялікім Княстве [4, k. 238; 12, s. 214]. У інструкцыі 1608 года даваўся дазвол на "пабор" для патрэб вядзення вайны ў Інфлянтах, аднак ён звязваўся з выкананнем шэрагу патрабаванняў, якія далей змяшчаліся ў тэксце [8, c. 71]. Усё гэта сведчыць пра тое, што полацкая шляхта выразна разумела сваё вольнае права адносна выплаты падаткаў і выкарыстоўвала яго як рычаг націску на палітычныя эліты дзяржавы з мэтай забеспячэння ўласных інтарэсаў.

Наступнай базавай каштоўнасцю шляхты Рэчы Паспалітай з'яўлялася роўнасць. Паводле яе падкрэсліваліся адсутнасць іерархіі і аднолькавыя правы і магчымасці ўдзелу ў палітычным жыцці ў межах шляхецкага стану. Дадзеная каштоўнасць адлюстроўвалася ў тэрміналогіі таго часу ў паняцці "братэрства". Папулярны моўны зварот "брацці нашы" выкарыстоўваўся для абазначэння грамадска-палітычнай агульнасці шляхецкага стану Рэчы Паспалітай [1, s. 89 – 92; 2, c. 92 – 93]. Пры гэтым вельмі часта падкрэслівалася дзяржаўная прыналежнасць шляхты ("брацці нашы Вялікага Княства Літоўскага", "Іх Мосці брацці нашы каронныя"). У інструкцыі паслам на Енджэеўскі з'езд 1607 года выкарыстоўваўся зварот "panowie bracia naszy koronni y Wielkiego Księstwa Litewskiego"[18] [6, k. 2]. У якасці формулы станавай салідарнасці выкарыстоўвалася таксама паняцце "міласці (прыязні) братэрскай". Ва ўзгаданай інструкцыі 1607 года занатавана: "A żeby na tym rokoszu wszytko zgodnie z miłości braterskiey zachowuiące qualitate stanu naszego szlacheckiego (...)"[19] [6, s. 3]. Братэрская прыязнь, безумоўна, магла ўяўляцца толькі паміж роўнымі па статусу людзьмі.

Таксама фундаментальнай шляхецкай каштоўнасцю з'яўлялася згода. Даследчык палітычнай гісторыі Рэчы Паспалітай Я. Экес нават вылучае дадзенае паняцце ў якасці галоўнага пры разуменні сутнасці палітычнага працэсу ў дзяржаве [25]. У інструкцыях полацкіх соймікаў можна вылучыць некалькі аспектаў дадзенага паняцця. Па-першае, згода разумелася ў значэнні знаходжання кампрамісу ў межах шляхецкага стану. Яскравым прыкладам гэтага будзе наказ з інструкцыі паслам на Енджэеўскі з'езд 1607 года: "Od nas na rokoszu posłanym wszytko zgodnie ze wszytkiemy stany namawiać i zawierać, tak iakobyśmy od opresij wszelakiey wolny być mogli"[20] [6, k. 3]. Па-другое, згода азначала прыняцце агульнага рашэння на сойме. У такім сэнсе дадзены тэрмін ужываецца найчасцей. Так, напрыклад, інструкцыя 1611 года па-

---

[16]"А паколькі ўхваленне тых падаткаў не было згодным і з многіх ваяводстваў і паветаў супраць іх пратэставалі, вольныя галасы якіх былі заглушаныя" (Пер. аўт.).

[17]"Пісар іх брацкі, паважаны шляхціц, як кажуць, у парушэнне права зняволены прыватнымі асобамі. І потым будучы некалькі разоў арыштаваны дагэтуль знаходзіцца ў зняволенні, што з'яўляецца парушэннем нашага паспалітавага права шляхецкай вольнасці" (Пер. аўт.).

[18]"паны брацці нашы каронныя і Вялікага Княства Літоўскага" (Пер. аўт.).

[19]"Каб на тым рокашы ўсё згодна з міласцю братэрскай, захоўваючы роўнасць стану нашага шляхецкага (…)" (Пер. аўт.).

[20]"Ад нас на рокаш пасланым усё згодна з усімі станамі абмяркоўваць і вырашаць, каб мы былі пазбаўлены ўсялякіх складаных сітуацый" (Пер. аўт.).

трабавала, каб справа, звязаная з "тумультам" і зруйнаваннем Віленскага евангеліцка-рэфармаванага збору, на сойме "za zgodą wszytkich była uspokojona"[21] [9, k. 51]. У тым жа сэнсе полацкая шляхта на сойміку ў чэрвені 1606 года не прызнала ўхвал сойму, які адбыўся напярэдадні, паколькі яны "mimo zgodnie niektorych pp. Posłow woiewodztw zupełnych także y innych niektorych z woiewodztw y powiatow protestancie tak Coronnych iako y Wielkiego Księstwa Litewskiego uczynione"[22] [5, k. 1]. Нарэшце, па-трэцяе, згода разумелася ў сэнсе спакою, міру. Так, у інструкцыі паслам на Люблінскі з'езд гаворыцца пра тое, "aby nie samemi tylko podatkami, ale y zgode Rzeczy Pospolitey wedle powinności pańskiey obrona była czyniona"[23] [5, k. 3].

Важную ролю мела таксама такая каштоўнасць, уласцівая для палітычнага мыслення сярэдніх вякоў і ранняга Новага часу, як шанаванне традыцыі. У адпаведнасці з ёй любыя палітычныя ініцыятывы, нават тыя, якія прадугледжвалі ўвядзенне прынцыпова новых з'яў, патрабавалася абгрунтаваць даўняй традыцыяй. У прамове Пятра Стаброўскага на Люблінскім з'ездзе 1606 года ідэя супраціўлення тыраніі падмацоўвалася шматлікімі спасылкамі на старажытныя прыклады з гісторыі краіны [23, s. 22 – 23]. Характэрна тое, што пры дапамозе канцэпту шанавання традыцыі і "даўніх правоў" полацкая шляхта лічыла неабходным захаванне прывілею Полацкай зямлі, які апошні раз пацвярджаўся Жыгімонтам Аўгустам у 1547 годзе [3, s. 422; 5, k. 3; 6, k. 3], хаця многія яго палажэнні не адпавядалі новай сацыяльна-палітычнай сітуацыі і нават супярэчылі прынцыпам шляхецкай дзяржавы.

На аснове сацыяльна-палітычных каштоўнасцей сфарміраваліся нормы, якія рэгулявалі паводзіны шляхты. Сярод іх можна вылучыць такія, як дзейнасць у адпаведнасці з правам і кампраміснасць.

Дзейнасць у адпаведнасці з правам грунтавалася на тым, што шляхта фактычна атаясамлівала дзяржаву са сваім станам і таму дзяржаўнае права разглядала не як знешнюю форму надіндывідуальнага прымусу, а як сродак рэгуляцыі грамадскіх адносін, створаны самой шляхтай для забеспячэння яе ўласных інтарэсаў. Дадзеная дзейнасць была цесна звязаная з практычнай абаронай шляхецкіх вольнасцей. Яскравым прыкладам для разумення гэтай сувязі можа быць цытата з інструкцыі на Люблінскі з'езд 1606 года: "(…) yeśliby ktory kolwiek y yakieykolwiek condityj stanu nie maiąc w tym zadnego respektu na osoby winnym pokazał na ktorego by pewne a nie wątpliwe dowody się pokazali, ktoryby radą swą y praktykami na opresją stanu naszego rycerskiego a na w inszem czemu praw wolności naszych radził praktyki czynic prawo pospolite znieważał przeciw niemu iawnie y tajemnie czynił do sedyciy y tumultow przyczyne dawał pokoy pospolity gwałcił, wykłady praw naszych inaczey niżli słowa opisane się maia czynił, taki każdy iako perduelis Rzeczy Pospolitey aby karan na wszytkim był, tak yakoby na wszytkie przyszłe czasy, pamiątka wieczna zostawała (...)"[24] [5, k. 3; 17, s. 157 – 158]. Пастаянныя ўзгадкі пра неабходнасць абароны шляхецкіх вольнасцей сведчаць пра тое, што іх практычная рэалізацыя лічылася нормай палітычных паводзін.

Кампраміснасць як норма палітычных паводзін вынікала з каштоўнасцей згоды, а таксама прызнання вольнасці і роўнасці ўсіх "абываццеляў" Рэчы Паспалітай. Менавіта таму дзеянні караля і сенатараў падчас сойму 1606 года выклікалі адмоўную рэакцыю полацкай шляхты. Імкненне да кампрамісу можна прадэманстраваць таксама на ўзгаданым ужо прыкладзе падтрымкі рэлігійных свабод шляхтай розных веравызнанняў. Культура кампрамісу выклікала стрыманае стаўленне да насілля. Шляхта нават ва ўмовах палітычных канфліктаў, як, напрыклад, рокаш, дэманстравала імкненне да пераважна мірнага вырашэння супярэчнасцяў і адмоўнае стаўленне да тых, хто"pokoy pospolity gwałcił"[25] [5, k. 3].

**Рэакцыя шляхты на рашэнні інстытутаў палітычнай сістэмы, а таксама патрабаванні і пажаданні шляхты ў адносінах да палітычнай сістэмы.** Пазначаны аспект уключае ў сябе спосабы рэагавання шляхты на дзейнасць уладных інстытутаў, якія адлюстроўваюць ступень падтрымкі грамадскасцю палітычнай сістэмы і ўзровень сацыяльнай дысцыпліны. Таксама сюды ўключаны тыпы патрабаванняў і пажаданняў шляхты ў дачыненні да асобных інстытутаў палітычнай сістэмы. У межах дадзенага аспекту неабходна праанализаваць некалькі праблем, звязаных з агульнадзяржаўнай і рэгіянальнай палітыкай.

Патрабаванні і пажаданні полацкай шляхты ў сферы дзяржаўна-палітычнага парадку і рэакцыя на адпаведныя рашэнні палітычных інстытутаў былі ў значнай ступені абумоўленыя ўяўленнямі пра належнае функцыянаванне палітычнай сістэмы і шляхецкімі сацыяльна-палітычнымі каштоўнасцямі.

---

[21]"за згодай усіх была заспакоеная" (Пер. аўт.).
[22]"нягледзячы на складзеныя ўзгоднена ад цэлых ваяводстваў, а таксама ад некаторых (паслоў – Заўвага аўт.). ваяводстваў і паветаў як каронных, так і Вялікага Княства Літоўскага пратэстацыі" (Пер. аўт.).
[23]"абы не толькіаднымі падаткамі, але і згодай Рэчы Паспалітай абарона (знешняя – Заўвага аўт.) паводле павіннасці да ўладара была ўчынена" (Пер. аўт.).
[24]"(…) калі б хто-небудзь якога-небудзь стану, не маючы ніякага асабістага інтарэсу, абвінавацiў пэўную асобу і калі б цвёрдыя і несумненныя доказы выявілі, што нехта сваімі парадамі і практыкамі імкнуўся да пагаршэння становішча нашага рыцарскага стану ці ў чым-небудзь абмежавання правоў і вольнасцяў, зневажаў права паспалітае, адкрыта або таемна пагарджаў ім, імкнуўся да мяцяжоў і забурэнняў, спрыяў парушэнню грамадскага спакою, інакш тлумачыў нашыя правы, чым як яны напісаны, такі кожны, каб быў пакараны як здраднік Рэчы Паспалітай так, каб на ўсе будучыя часы захавалася пра гэта памяць (…)" (Пер. аўт.).
[25]"парушаў грамадскі мір" (Пер. аўт.).

У першую чаргу сюды трэба залічыць патрабаванні да караля аб захаванні агульных асноў дзяржаўна-палітычнага ладу, якія манарх абавязваўся выконваць і якія ўключаліся ў пакт канвента [3, s. 422; 4, k. 237; 8, c. 71]. У інструкцыі 1598 года змяшчалася патрабаванне да караля аб гарантыях выканання “Генрыкавых артыкулаў”, у прыватнасці пункта, які прадугледжваў кантраляванне дзейнасці караля 16 сенатарамі-рэзідэнтамі [4, k. 237]. Чуткі аб спробах караля ўвесці ў Рэчы Паспалітай спадчынную манархію выклікалі патрабаванне захавання “вольнай элекцыі” ў інструкцыі на Люблінскі з’езд 1606 года [5, k. 2]. Полацкі соймік 1598 года выказваўся за ўзмацненне ролі ў парламенцкай сістэме дзяржавы пасольскай ізбы. Было выказана пажаданне, каб сенатары не ўваходзілі ў склад рэпрэзентацыі соймікаў [4, k. 237 – 238; 12, s. 216]. Яшчэ больш рашуча полацкі соймік выступаў за павышэнне ролі пасольскай ізбы ў палітычнай сістэме ў 1606 годзе [5, k. 1]. У “ракашовых” інструкцыях да шляхецкіх з’ездаў у Любліне і Енджэеве змяшчалася патрабаванне, якое традыцыйна адрасавалася соймавым станам, – забеспячэнне шляхецкіх правоў і вольнасцей. Адметным выступае патрабаванне суда шляхты над тымі сенатарамі, якія парушаюць права [5, k. 3]. Характэрным прыкладам рэакцыі полацкай шляхты на парушэнне права з боку караля быў яе ўдзел у барацьбе “абывацеляў” ВКЛ супраць намінацыі на пасаду віленскага біскупа паляка Бернарда Мацеёўскага насуперак Статуту ВКЛ, што доўжылася 10 гадоў і скончылася перамогай літвінскай шляхты. Гэты ўдзел зафіксаваны ў патрабаваннях соймікаў 1597 і 1598 гадоў аб адмене намінацыі Б. Мацяёўскага [3, s. 422; 4, k. 241].

Як відаць, полацкая шляхта паслядоўна дамагалася захавання прававых падстаў Рэчы Паспалітай, якія забяспечвалі пануючаму стану статус актыўнага суб’екта дзяржаўнай палітыкі, і востра рэагавала супраць спробаў абмежавання станавых правоў і прывілеяў.

Што датычыцца патрабаванняў полацкай шляхты адносна рэлігійнага пытання і яе рэакцыі ў адпаведнай сферы, то яны дастаткова поўна разгледжаны ў працах В. Галубовіча, Т. Кэмпы і Л. Ярміньскага [10; 12, s. 170 – 173, 213 – 217; 13, s. 143, 223, 234, 239 – 240, 266]. Нягледзячы на палітычныя і канфесійныя разыходжанні, полацкая шляхта рашуча выступала ў абарону прынцыпу рэлігійнай талеранцыі на аснове акту Варшаўскай канфедэрацыі. Прычыну гэтага можна бачыць не толькі ў колькаснай перавазе пратэстанцкіх і праваслаўных “абывацеляў” на Полаччыне, але і ў тым, што шляхта кіравалася каштоўнасцямі шляхецкай вольнасці, адным з аспектаў якой была свабода веравызнання.

Неадназначным было стаўленне полацкай шляхты да знешняй палітыкі, праводзімай уладамі Рэчы Паспалітай. На працягу 1592 – 1599 гадоў Жыгімонт Ваза з’яўляўся спадчынным каралём Шведскага Каралеўства. Яго праўленне на працягу ўсяго гэтага перыяду было нестабільным і абапіралася на вузкую сацыяльную базу. Крытычны момант наступіў у 1598 годзе, калі Жыгімонт Ваза склікаў вальны сойм з мэтай атрымаць згоды на паездку ў Швецыю ва ўмовах падрыхтоўкі ўзброенай барацьбы за ўладу з герцагам Карлам Сундэрманландскім. Полацкі перадсоймавы соймік, як і большасць іншых соймікаў ВКЛ, выказаў згоду на ад’езд караля, аднак у той жа час выказаў занепакоенасць перспектывай уцягвання Рэчы Паспалітай у вайну ва ўмовах адсутнасці трывалага міру з Маскоўскай дзяржавай і Асманскай імперыяй: “Aby Corona y Wielkie Ksiestwo Litewskie w żadną wojnę s Krolestwem Szwedzkim zaciągać nie pozwolili, oglądaiąc nieprzyjacioł pogranicznych tak koronnego iako y Wielkiego Księstwa Litewskiego s ktorymi nic zawartego strony pokoiu nie mamy”[26] [4, k. 237]. Адначасова трэба звярнуць увагу на тое, што полацкая шляхта і ў 1597, і ў 1598 гадах выступала за актывізацыю мірных перамоваў з Масковіяй [3, s. 422; 4, k. 237]. З-за адсутнасці крыніц мы не ведаем пра пазіцыю полацкай шляхты ў перыяд пачатку вайны паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй у 1600 – 1611 гадах. У інструкцыі 1608 года змяшчаюцца меркаванні наконт далейшага паспяховага вядзення вайны; пры гэтым падкрэсліваецца неабходнасць захавання мірных адносін з Масковіяй і Турцыяй [8, s. 71].

У 1609 годзе Рэч Паспалітая апынулася ў стане вайны з Маскоўскай дзяржавай. Нягледзячы на паспяховы пачатак вайны, яе далейшы працяг не выклікаў энтузіязму сярод значнай часткі шляхты Рэчы Паспалітай. Інструкцыя полацкага сойміку 1611 года не змяшчала выразаў падзякі каралю за вайсковыя перамогі і пашырэнне межаў дзяржавы. Сярод вядомых перадсоймавых інструкцый з ВКЛ 1611 года гэта быў адзіны выпадак (у Каралеўстве Польскім не змясцілі выразаў падзякі пяць соймікаў). На думку Э. Апаліньскага, гэта была беспрэцэдэнтная з’ява, якая парушала даўнія палітычныя традыцыі [1, s. 138 – 139]. Полацкая шляхта скардзілася на зацягванне вайны, на небяспеку з боку Швецыі і Турцыі. Больш за тое, яна асудзіла сам факт развязвання вайны, патрабавала выявіць і пакараць яе арганізатараў, а таксама забараніць распачынаць войны без згоды сойму [9, k. 49; 26, s. 66]. Аналагічнае патрабаванне было змешчана ў інструкцыі люблінскага сойміку ад 22 жніўня 1611 года Э. Апаліньскі вызначае падобныя патрабаванні як пераломны момант, калі шляхта Рэчы Паспалітай упершыню паставіла пад сумненне права манархаў распачынаць войны без згоды сойма [1, s. 138].

[26]“Каб Карона і Вялікае Княства Літоўскае ні ў якую вайну з Каралеўствам Шведскім ўцягнуць сябе не дазволілі, маючы на ўвазе непрыяцеляў памежных, як Кароны, так і Вялікага Княства Літоўскага, з якімі не маем ўсталяванага міру” (Пер. аўт.).

З аналізу соймікавых інструкцый можна заўважыць пераважна негатыўнае стаўленне полацкай шляхты да войнаў, якія праводзіла Рэч Паспалітая, і імкненне да падтрымання мірных адносін з суседнімі дзяржавамі. Чым гэта можна патлумачыць? Істотная роля ў фарміраванні такіх поглядаў належыць, безумоўна, распаўсюджанню сярод шляхты негатыўнага стаўлення да правядзення войнаў за межамі дзяржавы [1, s. 200]. Аднак трэба мець таксама на ўвазе канкрэтна-гістарычныя абставіны. Сярод полацкай шляхты ў разглядаемы час яшчэ захоўвалася памяць пра Інфлянцкую вайну 1558 – 1583 гадоў, калі частка ваяводства разам з Полацкам была акупавана маскоўскімі войскамі. Падчас войнаў пачатку XVII стагоддзя тэрыторыя Полацкага ваяводства выкарыстоўвалася для дыслакацыі войска Рэчы Паспалітай. Насельніцтва цярпела ад самавольства жаўнераў. Улічваючы тое, што пераважная большасць полацкай шляхты была незаможнай, падобныя факты адмоўна адбіваліся на яе эканамічным становішчы. Да таго ж пастаянна існавала небяспека распаўсюджання баявых дзеянняў у войнах як са Швецыяй, так і з Масковіяй на тэрыторыю Полаччыны.

З правядзеннем войнаў і абарончых мерапрыемстваў былі цесна звязаныя праблемы падаткова-фінансавай палітыкі. Згода на збор “пабору” сведчыла аб узроўні сацыяльнай дысцыпліны сярод шляхты, але яна таксама часта суправаджалася патрабаваннямі да забеспячэння інтарэсаў “абываceляў”. Цікавымі з’яўляюцца праекты рэфармавання падаткова-фінансавай сістэмы, прадстаўленыя ў інструкцыях полацкіх соймікаў 1598, 1606 і 1611 гадоў, якія разглядаліся ў даследаваннях Л. Ярміньскага і Я. Мацішэўскага [12, s. 214 – 215; 17, s. 158]. У 1598 годзе полацкая шляхта патрабавала перадачы на карысць дзяржаўнага скарбу трацiны даходаў з каралеўшчын, прыбыткаў ад манетнага двара, а таксама выплаты на карысць скарбу пэўных сум прускім князем і іншымі леннікамі Рэчы Паспалітай. У згодзе з іншымі соймікамі ВКЛ была актуалізавана прапанова аб тым, каб выдаткі, звязаныя з адпраўленнем даніны Крымскаму ханству (“памінкаў татарскіх”), ажыццяўляліся за кошт Польскага Каралеўства [4, k. 238]. Інструкцыя 1606 года таксама змяшчае патрабаванне стварэння сталай крыніцы фінансавага забеспячэння войска з дзяржаўных маёмасцяў [5, k. 3]. Можна пагадзіцца з Я. Мацішэўскім, што ў падобных патрабаваннях гучала імкненне дробнай шляхты перакласці цяжар фінансавых выдаткаў на магнатаў, якія часта з’яўляліся трымальнікамі дзяржаўных маёнткаў [17, s. 158].

Акрамя агульнадзяржаўных полацкая шляхта змяшчала ў соймікавых інструкцыях таксама пастулаты рэгіянальнага характару. Найбольш важнымі сярод іх выступаюць патрабаванні выбараў полацкага ваяводы і скасавання ўнутраных мытняў у дзвінскім гандлі.

Першае з іх упершыню выступае ў інструкцыі 1597 года [3, s. 422]. Больш разгорнута гэтае патрабаванне сфармулявана ў інструкцыі паслам на Люблінскі з’езд 1606 года: “(…) o to się starac maią, aby ten przywilej nasz wcale był trzymany, a co by przeciwnego prawu naszemu było aby to zniesiono moca zjazdu tamtesznego było, a osobliwie iż mamy wolne obiranie wojewody y insze wolności temu należące, tedy aby po śmierci każdego wojewody wolna electia nam zostawała”[27] [5, k. 3]. Справа ў тым, што прывілеі вялікіх князёў літоўскіх Полацкай зямлі ўтрымлівалі пункт, паводле якога на пасаду полацкага ваяводы павінна быць прызначаная асоба, якую абрала мясцовая шляхта: “давати нам воеводу нашого полочаном по их воли. А которыи будеть воевода наш нелюб, и нам им воеводу нашого дати по их воли” [27, с. 90]. Як абгрунтавалі ў сваіх даследаваннях І. Лапо, М. Спірыдонаў і В. Варонін, у рэчаіснасці ваяводы прызначаліся вялікім князем [28, с. 582 – 583; 29, с. 28; 30, с. 7]. На гэта яскрава паказвае і патрабаванне шляхты ў інструкцыі 1606 года. Аднак полацкая шляхта захоўвала веданне зместу Полацкага прывілею і імкнулася да рэалізацыі змешчаных у ім пастулатаў. Гэта з’яўляецца сведчаннем захавання ў яе асяроддзі ўяўленняў аб аўтарытэтнасці мясцовага права і элементаў рэгіянальнай самасвядомасці.

Патрабаванне скасавання ўнутраных мытняў у дзвінскім гандлі было змешчана ў інструкцыях 1598 і 1606 гадоў [4, k. 239; 5, k. 343]. Полаччына традыцыйна падтрымлівала цесныя гандлёвыя сувязі з Рыгай. На тэрыторыі Полацкага ваяводства знаходзіліся дзве мытныя акругі ў Полацку і Дзісне. Памеры мыта павялічыліся падчас вайны са Швецыяй 1600 – 1611 гадоў. Існаванне ўнутраных мытняў было выгадна для буйных магнатаў Радзівілаў і Сапегаў, кліенты якіх займалі вядучыя адміністрацыйныя пасады на землях у сярэднім цячэнні Дзвіны [31, с. 143 – 147]. У інструкцыі 1606 года ўтрымлівалася патрабаванне да Люблінскага шляхецкага з’езду ліквідаваць унутраныя мытні, паколькі яны перашкаджаюць развіццю гандлю і садзейнічаюць павышэнню коштаў. На сойме 1607 года было забаронена браць мыта са шляхецкіх тавараў у Кокенгаўзе і Дынабургу (Інфлянты), аднак зборы з купцоў захаваліся [32, с. 449]. Адметна тое, што соймікавая інструкцыя 1606 года выступала ў дадзенай справе ў абарону не толькі полацкай шляхты, але і мяшчанства: “стан шляхецкі і купецкі маюць цяжкасці”. Прычынай такой салідарнасці можа быць не толькі эканамічны інтарэс, але і захаванне сярод полацкай шляхты рэшткаў агульна-грамадзянскай свядомасці жыхароў Полацкай зямлі, якая на той час яшчэ не была цалкам выцеснена кар-

[27] ”(…) павінны імкнуцца да таго, каб прывілей наш быў цалкам захаваны, а тое, што супярэчыць нашаму праву, каб было ліквідавана на бягучым з’ездзе, а асабліва маем на ўвазе вольнае абіранне ваяводы і іншыя вольнасці з гэтым звязаныя, каб пасля смерці кожнага ваяводы была б вольная элекцыя” (Пер. аўт.).

паратыўнай станавай свядомасцю. Праз некалькі дзесяцігоддзяў, у перадсоймавай інструкцыі 1632 года, дзе шмат увагі было прысвечана праблеме недапушчэння ў прывілеяваны стан новых людзей, ужо выразна прасочваецца дамінацыя карпаратыўнай свядомасці [33, с. 54 – 55].

**Заключэнне.** Праведзены аналіз палітычнай культуры полацкай шляхты на мяжы XVI – XVII стагоддзяў дазваляе сцвярджаць, што дадзеная культура характарызуецца высокай ступенню ўдзелу ў функцыянаванні палітычнай сістэмы. Шляхта, прынамсі тая яе частка, якая прымала ўдзел у сойміках, праяўляла значную палітычную актыўнасць. Шляхта добра разумела сутнасць палітычнай сістэмы і была ўпэўненая ў сваіх магчымасцях уплыву на палітычныя рашэнні; яна ведала свае правы і заўсёды была напагатове да іх абароны. У палітычнай свядомасці прадстаўнікоў прывілеяванага стану трывала замацаваліся такія каштоўнасці, як “вольнасць”, “роўнасць”, “братэрства”, “згода”, “шанаванне традыцыі”, а таксама вытворныя ад іх нормы палітычных паводзін, такія як дзейнасць у адпаведнасці з правам і кампраміснасць. У сваіх палітычных патрабаваннях полацкая шляхта акцэнтавала ўвагу на неабходнасці захавання існуючага дзяржаўна-палітычнага і прававога парадку, рэлігійнай талерантнасці, правядзення знешняй палітыкі, арыентаванай на мірныя адносіны з суседнімі дзяржавамі, эфектыўнай арганізацыі дзяржаўных фінансаў. Разам з тым у палітычнай культуры полацкай шляхты ў гэты перыяд яшчэ захоўваліся элементы рэгіянальнай свядомасці. Гэта пацвярджаецца павагай да полацкай палітычнай і прававой традыцыі, добрым веданнем мясцовых прывілеяў, імкненнямі да рэалізацыі асобных элементаў аўтаноміі Полаччыны, якая існавала ў папярэднія стагоддзі.

ЛІТАРАТУРА

1. Opaliński, E. Kultura polityczna szlachty polskiej w latach 1587 – 1652 / E. Opaliński. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 1995. – 347 s.
2. Лойка, П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. / П.А. Лойка. – Мінск: БДУ, 2002. – 99 с.
3. Dyaryusze sejmowe r. 1597; wyd. E. Barwiński. – Kraków: Nakład Akademii Umiejetności, 1907. – XXVIII, 545 s.
4. Biblioteka książąt Czartoryskich (BCzart.) w Krakowie. – Sygn. 2234.
5. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD) w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dział II. – Nr 450.
6. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD) w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dział II. – Nr 510.
7. Biblioteka Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności (BPAU-PAN) w Krakowie. – Sygn. 360.
8. Галубовіч, В. Інструкцыя полацкай шляхты на сойм 1608 г. / В. Галубовіч, А. Радаман // Полацкія гістарычныя запіскі. – Т. III. – 2006. – С. 70 – 72.
9. Biblioteka Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności (BPAU-PAN) w Krakowie. – Sygn. 365.
10. Галубовіч, В. Канфесійная праблематыка на сойміках Полацкага ваяводства ў канцы XVI – сярэдзіне XVII ст. / В. Галубовіч // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт.: у 2-х ч. Ч. 1; рэдкал.: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 179 – 185.
11. Жукович, П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 года) / П. Жукович. – СПб.: Тип. Главнаго Управления Уделов, 1901. – XXI, 594 с.
12. Jarmiński, L. Bez użycia siły: działalność polityczna protestantów w Rzeczypospolitej u schyłku XVI wieku / L. Jarmiński. – Warszawa: Semper, 1992. – 269 s.
13. Kempa T. Wobec kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń: Adam Marszałek, 2007. – 624 s.
14. Opaliński, E. Sejmiki szlacheckie wobec kwestii tolerancji religijnej w latach 1587 – 1648 / E. Opaliński // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – T. 34. – 1989. – S. 21 – 40.
15. Wiśner, H. Rozróżnieni w wierze. Szkice z dziejów Rzeczypospolitej schyłku XVI i połowy XVII wieku / H. Wiśner. – Warszawa: Książka i wiedza, 1982. – 216 s.
16. Wiśner, H. Sejmiki litewskie i kwestia wyznaniowa 1611 – 1648 / H. Wiśner // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – T. 23. – 1978. – S. 123 – 150.
17. Maciszewski, J. Wojna domowa w Polsce (1606 – 1609): studium z dziejów walki przeciw kontrreformacji. Cz. 1: Od Stężycy do Janowca / J Maciszewski. – Wrocław: Zakł Nar. im. Ossolińskich, 1960. – VI, 368 s.
18. Maciszewski, J. Jeziorna 1607 (wokół uniwersału detronizacyjnego rekonesans badawczy) / J. Maciszewski // Świat pogranicza/ [red. nauk. M. Nagielski, A. Rachuba, S. Górzyński]. – Warszawa: ”DiG”, 2003. – S. 210 – 221.

19. Wiśner, H. Litwa wobec rokoszu (1606 – 1607) / H. Wiśner // Kwartalnik Historyczny. – T. – 1972. – Z. 2. – S. 278 – 299.
20. Галубовіч, В.У. Каталіцкая царква ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI – першай палове XVII стст. / В.У. Галубовіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2011. – № 1. – С. 13 – 17.
21. Галубовіч, В.У. Праваслаўная шляхта ў кантэксце канфесійнага жыцця Полацкага ваяводства ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII стст. / В.У. Галубовіч // Міжканфесійныя адносіны ў Полацкім ваяводстве (другая палова XVI – першая палова XVII ст.): отчет о НИР (заключ.) / Полоц. гос. ун-т; рук. темы И.А. Бортник. – 2011. – С. 25 – 31 – № Г09ПЛ-003.
22. Галубовіч, В. Шляхта польскага паходжання ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI – XVII ст. / В. Галубовіч // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі: да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея. – Полацк: НПГКМЗ, 2008. – С. 47 – 55.
23. Rokosz Zebrzydowskiego. Materyały historyczne poprzedzone przedmową i rozprawą pod tytułem Konfederacya i rokosz w dawnem prawie państwowem polskim; wyd. A. Rembowski. – Warszawa: Druk. E. Lubowskiego i S-ki Mazowiecka, 1893. – XXX, [315], 535 s.
24. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD) w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dział II. – Nr 507.
25. Ekes, J. O państwo zgody: Z dziejów ideologii politycznej w Polsce w latach 1587 – 1605. Praca doktorska / J. Ekes. – Warszawa, 1974. – 332 s.
26. Byliński, J. Sejm z roku 1611 / J. Byliński. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1970. – 248 s.
27. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 5 т.; изд. А.Л. Хорошкевич. – М.: Изд-во АН СССР, 1977 – 1983. – Вып. 3; 1980. – 215 с.
28. Лаппо, И.И. Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии да смерти Стефана Батория (1569 – 1586). Опыт исследования политического и общественного строя / И.И. Лаппо. – Т. 1. – СПб.: Тип. И.Н. Скороходова, 1901. – XVI, 780 с.
29. Варонін, В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. / В. Варонін // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. – Сш. 1 (8). – 1998. – С. 27 – 66.
30. Спірыдонаў, М. Полаччына ў сярэдзіне XVI ст. / М. Спірыдонаў // Полацкія гістарычныя запіскі. – Т. I. – 2004. – С. 5 – 19.
31. Якубаў, В.У. Сапегі ў барацьбе Жыгімонта Вазы за шведскую карону 1594 – 1611 г. / В.У. Якубаў // Леў Сапега (1557 – 1633) і яго час: матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Гродна 4 – 5 красавіка 2007 г.; рэдкал.: С.В. Марозава, В.У. Галубовіч, А.І. Груша. – Гродна, 2007. – С. 143 – 149.
32. Volumina legum: w 9 t. / przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od r. 1732 do r. 1782, wydanego. – SPb.: Druk. J. Ohryzki, 1859 – 1860. – T. 2: Ab anno 1550 ad annum 1609. – 1859. – 483 s.
33. Галубовіч, В.У. Інструкцыя полацкай шляхты на элекцыйны сойм 1633 г. / В.У. Галубовіч // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V міжнар. навук. канф. (24 – 25 кастр. 2007 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2009. – С. 51 – 58.

*Паступіў 03.04.2013*

## THE POLITICAL CULTURE OF THE POLATSK VOIVODESHIP NOBILITY AT THE END OF THE XVI^TH^ – BEGINNING OF THE XVII^TH^ CENTURIES AS PRESENTED IN THE INSTRUCTIONS OF THE DIETINES

***I. BORTNIK***

*The article deals with the peculiarities of the functioning of the political culture among the Polatsk voivodeship nobility at the end of the XVI$^{th}$ – beginning of the XVII$^{th}$ centuries. The research of this phenomenon idone on the basis of the dietine instructions makes it possible to single out the following three aspects: the attitude of the nobility to the current political culture and its most important institutions; the nobility's socio-political values and the standards of their conduct; the response of the nobility to the decisions of the political institutions, the nobility's demands and wishes to them. It is stated that the culture of the nobility in the lands of Polatsk was characterized by the high level of political activity. The nobility understood the essence of the political system very well and were sure of their own abilities to influence political decisions. Such values as "liberty", "equality", "brotherhood", "amity" and respect to traditions were ingrained in the nobility's political consciousness. Still some elements of the regional consciousness were preserved in the political culture of the nobility of Polatsk at the same time.*